# ВЫКАРЫСТАННЕ НАРОДНАГА ФАЛЬКЛОРУ І МЯСЦОВАГА МАТЭРЫЯЛУ Ў ДАСЛЕДНІЦКАЙ ПРАЦЫ ВУЧНЯЎ НА ПРЫКЛАДЗЕ АНАЛІЗУ РОЛІ НАРОДНЫХ ПРЫКМЕТ ПРЫ ПРАГНАЗАВАННІ НАДВОР'Я

**Т. С. Бруй**

*УА «Дзяржаўная сярэдняя школа №3 г.п. Зэльва»*
*Гродзенская вобласць, Рэспубліка Беларусь,* brui.tatyana1969@gmail.com

У працы разглядаецца магчымасць выкарыстання краязнаўчага матэрыялу і народнага фальклору пры арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў. У даследніцкай дзейнасці па геаграфіі значнае роля надаецца краязнаўчаму матэрыялу. Гэта дазваляе вучням асэнсаваць непаўторнасць і ўнікальнасць прыроды сваёй малой радзімы, яе гістарычнай і культурнай спадчыны. Праца з краязнаўчым матэрыялам дае магчымасць паглядзець на звыклыя рэчы вакол іх іншым поглядам, паглыбіць свае веды аб тым, што здавалася даўно ўжо ведаеш.

***Ключавыя словы:*** народныя прыкметы; надвор'е; спадчына; геаграфія; фальклор; краязнаўства.

На працягу многіх гадоў вучні школы пастаянна ўдзельнічаюць у раённай навукова-практычнай канферэнцыі. Даследаваліся розныя прыродныя аб'екты і ўмовы, дэмаграфічная сітуацыя на тэрыторыі раёна, аспекты гаспадарчай дзейнасці насельніцтва.

Аб'ектам даследавання апошняй працы сталі народныя прыкметы надвор'я. Прадметам даследавання – надзейнасць і актуальнасць народных прыкмет у складанні прагнозу надвор'я.

Актуальнасць даннай працы заключаецца ў першую чаргу ў тым, што ў наш тэхналагічны час патрэбна быць бліжэй да народных вытокаў, так як народныя прыкметы важная частка народнага фальклору.

У працы была пастаўлена задача вызначыць ролю народных прыкмет для складання прагнозу надвор'я. У ходзе даследавання было праведзена анкетаванне аб прагнозе надвор'я і народных прыкметах сярод настаўнікаў і вучняў нашай школы. А таксама зроблена спроба супаставіць некаторыя народныя прыкметы з вынікамі назірання за надвор'ем. Патрэбна было вызначыць ці з'яўляюцца народныя прыкметы да цяперашняга часу актуальныя і выкарыстоўваюцца людзьмі для вызначэння надвор'я.

Практычная значнасць працы заключаецца ў магчымасці выкарыстання яе вынікаў на ўроках геаграфіі і выхаваўчай рабоце, што дае магчымасць вучням развіваць назіральнасць, быць больш беражлівымі да сваёй прыроды.

Для вырашэння пастаўленых задач і выкарыстання метадаў даследавання выкарыстоўваліся розныя крыніцы літаратуры. Сярод іх можна вылучыць, у першую чаргу, матэрыялы кніг «Дзень за днем» пад рэдакцыяй А.У Русецкага [1] і «Земляробчы каляндар: абрады і звычаі» [2], артыкулы раённай газеты «Праца" і рэспубліканскай газеты «Звязда». Акрамя гэтага, у рабоце быў выкарыстаны матэрыял краязнаўчага музея нашай установы адукацыі.

Прадказанне надвор'я па народных прыкметах гэта бясцэнная спадчына, атрыманая намі ад продкаў, якія назіралі за прыродай і ўзаемасувяззю ўсяго жывога ў ёй. «Прыкмета гэта з'ява, выпадак, які ў народзе лічыцца прадвесцем чаго-небудзь» [3]. Было вызначана, што ўсе прыкметы можна падзяліць на групы па такіх рысах, як час прагнозу, поры года, пра якія гаворыцца ў прыкмеце, а таксама па аб'екту жывой і нежывой прыроды, на які звяртаецца ўвага ў прыкмеце.

У ходзе даследвання ўстаноўлена, што па часу, на які робіцца прагноз, прыкметы можна падзяліць на дзве групы: прыкметы кароткачасовага прагнозу і прыкметы доўгачасовага прагнозу. Кароткачасовы прагноз звычайна больш дакладны і мае пад сабой навуковае тлумачэнне. Доўгатэрміновыя прыкметы звычайна прывязаныя да пэўнай каляндарнай даты і прагназуюць надвор'е на наступны месяц ці нават сезон. Растлумачыць такія прагнозы на доўгі тэрмін вельмі складана або нават немагчыма. Доўгатэрміновая прыкмета гэта свайго роду народная аксіёма, якая не мае навуковага падцвярджэння.

Было вызначана, што вялікая колькасць народных прыкмет надвор'я прымеркавана да пэўнай пары года. Кожная з іх адлюстроўвае тыя з'явы і падзеі ў гаспадарчым жыцці чалавека, якія характэрны для кожнага сезона.

Веснавыя прыкметы часта звязаны з абуджэннем прыроды і пасяўнымі работамі, усё гэта здаўна цікавіла чалавека. Шмат народных прыкмет сведчыць пра змену надвор'я летам, некаторыя летнія прыкметы гавораць нам, якой чакаць восень. У народных прыкметах пачатак восені асацыіруецца з адлётам птушак, лістападам, частымі дажджамі і туманамі, першымі замаразкамі і, безумоўна, зборам ураджаю і падрыхтоўкай да зімы. Існуе мноства народных прыкмет зімы, якія дапамагаюць прадказаць, якое надвор'е чакаць у бліжэйшыя дні, да якой з'явы прыроды рыхтавацца.

У ходзе даследвання ўстаноўлена, што усе народныя прыкметы, звязаныя з надвор'ем, можна таксама ўмоўна падзяліць на некалькі груп па тых аб'ектах прыроды, пра якія гаворыцца ў прыкмеце. Па-першае, падзел заснаваны толькі на тым, што гэта аб'екты ці з'явы жывой ці нежывой прыроды. Па-другое, так як прыкмет жывой прыроды вельмі шмат, можна ўдакладніць, хто з'яўляецца галоўнай дзеючай асобай

прыкметы: звяры, птушкі, насякомыя ці расліны і г.д. Найбольшую колькасць метэаралагічных прагнозаў складаюць народныя павер'і, заснаваныя на назіраннях людзей за прадстаўнікамі мясцовай флоры і фауны.

У працы цэлы раздел прысвечаны пытанню: «А якія прыкметы надвор'я выкарыстоўваліся і выкарыстоўваюцца жыхарамі нашага Зэльвенскага краю?». Сабрана мноства ўнікальных прыкмет Зэльвеншчыны, якія з'яўляюцца скарбамі вуснай народнай творчасці і культуры нашай малой радзімы [4].

Праведзены параўнальны аналіз назіранняў за надвор'ем і прыкмет з народнага беларускага календара. Аналіз данных паказаў, што большасць народных прыкмет пацвердзілася, прыкладна 58 %; часткова пацвердзіліся 14 %. Безумоўна, паказчык верагоднасці прагнозу па народным прыкметам ніжэй, чым прагноз метэаралагічных служб, дзе верагоднасць складае 85-90 %. Але трэба зазначыць, што прыкметы існуюць даўно, ім ужо не адзін дзясятак, а то і сотня гадоў. За гэты час у клімаце нашай тэрыторыі адбыліся пэўныя змены. У першую чаргу гэта пацяпленне. Гэтым, магчыма, можна тлумачыць разыходжанне прыкмет народнага календара ад прагнозу надвор'я метэаслужбамі [5].

Вызначанна актуальнасць выкарыстання народных прыкмет надвор'я ў сучаснасці с дапамогай анкетавання. Былі атрыманы наступныя вынікі: найбольш распаўсюджанай крыніцай атрымання інфармацыі аб надвор'і з'яўляецца інтэрнэт (50 % вучняў і 45 % настаўнікаў), аднак 10 % вучняў і 26 % настаўнікаў выкарыстоўваюць народныя прыкметы. Найбольш частым аргументам на карысць ведання народных прыкмет стаў адказ пра тое, што патрэбна ведаць наш фальклор, бо гэта наша спадчына.

Сабраныя намі прыкметы перадаюцца з пакалення ўпакаленне, завешчанае нам ад нашых продкаў. Вывучаная тэма дазваляе цесна сутыкнуцца з народным жыццём, з духоўнай культурай жыхароў нашага краю. Зроблены вынік, што патрэбна папулярызаваць такую важную частку народнага фальклору, як прыкметы надвор'я. Гэта дапаможа не толькі захаваць спадчыну нашых продкаў, але і быць бліжэй да роднай прыроды, выхоўваць у вучняў назіральнасць, кемлівасць і неабыякавасць да ўсяго, што вакол нас, што мы называем малой радзімай.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Дзень за днём: прыкметы надвор'я, а таксама народны каляндар-месяцаслоў : [для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту / сабраў і апрацаваў А. Русецкі ; мастак В. Александровіч]. Мінск: Юнацтва. 1997. 158 с.

2. Гурскі А. І. Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі. Укладальнік і сістэматызацыя матэрыялаў. Мінск: Беларуская навука. 2003. 429 с.

3. Люты-жартаўнік: удзень – да 6 цяпла, а ноччу – усе мінус 13 [Электронный ресурс]. URL : https://zviazda.by (дата обращения : 12.02.2023).
4. Матэрыялы школьнага краязнаўчага музея. Гісторыі і паданні Зэльвенскага краю. ЗМШ №3/КП-294. 32 с.
5. Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. арт. Вып. 7 : Памяці прафесара Ігара Васільевіча Жука / ГрДУ імя Я. Купалы, каф. бел. філал. ; рэдкал.:М. А. Даніловіч (гал. рэд.), А. Э. Сабуць (гал. рэд.) [і інш.]. Гродна : ГрДУ, 2018. 291 с.